# УКАЗ

**ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР**

**Аб узнагароджанні Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў, калгасаў і саўгасаў рэспублікі.**

**За дасягненне высокіх рэзультатаў у сацыялістычным спаборніцтве за дастойную сустрэчу 60-годдзя Беларускай ССР і Кампартыі Беларусі ўзнагародзіць:**

**ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР**

**Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна.**

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
І. ПАЛЯКОЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Л. ЧАГІНА.


ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 38 (1225) 21 снежня 1978 г.

Цана 2 кап.


# ВЫСОКАЯ ЎЗНАГАРОДА

**З вялікім натхненнем калектыў універсітэта ўспрыняў вестку аб тым, што за дасягненне высокіх паказчыкаў па дастойнай сустрэчы знамянальнай падзеі ў гісторыі беларускага народа — 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна ўзнагароджан Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.**

**Высокая ўрадавая ўзнагарода — гэта прызнанне вялікага ўкладу універсітэта ў справу падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, навукі і культуры рэспублікі, у развіццё фундаментальных і прыкладных даследаванняў.**

**За гады свайго існавання універсітэт падрыхтаваў каля 60 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў, многія з якіх сталі вядомымі партыйнымі і дзяржаўнымі дзеячамі, буйнымі вучонымі, пісьменнікамі і паэтамі.**

**Вучоныя універсітэта дабіліся значных поспехаў у галінах грамадскіх, гуманітарных даследаванняў, у даследаваннях па матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі і ў іншых галінах, у выкананні навукова-даследчых работ прыкладнога характару. Імі за перыяд з 1970 па 1978 год надрукавана 726 манаграфій, падручнікаў і дапаможнікаў, атрымана 387 станоўчых рашэнняў і аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы. Вялікі эканамічны эфект атрыман ад укаранення вынікаў завершаных навукова-даследчых работ у вытворчасць.**

**Універсітэт вядзе падрыхтоўку спецыялістаў для 60 краін свету. У 1978 годзе універсітэт урадам Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам за падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў для СРВ узнагароджан ордэнам Дружбы.**

**Рэктаратам, парткомам, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацыямі праводзіцца вялікая, мэтанакіраваная работа па камуністычнаму выхаванню студэнцкай моладзі, развіццю спорту і мастацкай самадзейнасці.**

**Выказваючы вялікую падзяку за высокую ацэнку нашай працы, калектыў універсітэта ў поўнай меры ўсведамляе, што высокая ўзнагарода да многага абавязвае, накладвае на нас вялізную адказнасць перад партыяй і народам за паспяховае выкананне рашэнняў XXV з'езда КПСС, за далейшае павышэнне навукова-тэарэтычнага ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў, творчае ўдасканаленне навучальнага працэсу на сучаснай навуковай аснове, выхаванне студэнтаў у духу марксісцка-ленінскага светапогляду, камуністычнай перакананасці, бязмежнай любві і адданасці сваёй вялікай сацыялістычнай Радзіме.**

**РЭКТАРАТ**
**ПАРТКОМ**
**МЯСЦКОМ**
**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА**
**ПРАФКОМ.**

60 год БССР КПБ

## У БРАЦКІМ САЮЗЕ, У ДРУЖНАЙ СЯМ'І

Амаль ва ўсіх пярвічных камсамольскіх арганізацыях факультэта прыкладной матэматыкі адначасова прайшоў Ленінскі ўрок «У брацкім саюзе, у дружнай сям'і», прысвечаны ўтварэнню Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і Кампартыі Беларусі. Студэнты загадзя рыхтаваліся да яго. У дзень правядзення ўрока аўдыторыі былі ўпрыгожаны плакатам і святочнымі лозунгамі.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны Мікалай Аляксандравіч Каваленка, старшы лабарант кафедры агульнага праграміравання, якога студэнты 2-га патока першага курса запрасілі прыняць удзел у правядзенні Ленінскага ўрока, расказаў прысутным аб тым, якой была раней і якой стала наша рэспубліка.

Аб тым, якую ролю адыграла Камуністычная партыя Беларусі ў гісторыі нашай рэспублікі, расказаў студэнтам 1-га патока другога курса дацэнт кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў Пётр Іосіфавіч Зялінскі.

А намеснік дэкана ФПМ Уладзімір Трафімавіч Воднеў, які стаў удзельнікам Ленінскага ўрока студэнтаў 3-га патока другога курса, расказаў аб развіцці флагмана беларускай навукі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Самі камсамольцы ў час правядзення Ленінскага ўрока гаварылі аб тым, з якімі дасягненнямі прыйшлі яны да юбілею рэспублікі, чым жыве зараз камсамольская арганізацыя факультэта.

«60-годдзю БССР і КПБ — выдатную вучобу!» — такі дэвіз студэнтаў.

**Т. САХАШЧЫК.**

# ФАКУЛЬТЭТ ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ: ЯКІМ ЯМУ БЫЦЬ?

У ПАСТАНОВЕ ЦК КПСС «Аб рабоце ў Маскоўскім вышэйшым вучылішчы імя М. Э. Баумана і Саратаўскім дзяржаўным універсітэце імя М. Р. Чарнышэўскага па павышэнню ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню выкладання грамадскіх навук» адзначаецца, што ў камуністычным выхаванні студэнтаў важнае месца павінны займаць такія формы, як школа маладога лектара, факультэты грамадскіх прафесій і інш.

У палажэнні аб факультэтах грамадскіх прафесій адзначаецца, што яны ў вышэйшых навучальных установах заклікаsuccessful садзейнічаць паляпшэнню ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў, усебаковаму развіццю маладых спецыялістаў і падрыхтоўцы іх да актыўнай грамадскай дзейнасці.

Калі разглядаць гэтыя задачы ў комплексе, то стане відавочным, што ў рабоце факультэта грамадскіх прафесій павінны быць зацікаўлены ўсе кафедры універсітэта, партбюро, камітэты камсамола, прафкомы і прафбюро факультэтаў. Ад узроўню іх арганізатарскай работы ў многім залежыць мэтанакіраваная і эфектыўная дзейнасць факультэта грамадскіх прафесій.

Належыць адзначыць, што ў бягучым навучальным годзе адбыліся значныя зрухі да лепшага ў рабоце грамадскіх арганізацый універсітэта. Так, камітэт камсамола стаў больш займацца работай школы маладога лектара. Зацверджан адказны за работу гэтай школы — член камітэта камсамола аспірант кафедры гісторыі КПСС В. Андруховіч. 30 лістапада на бюро камітэта камсамола была заслухана справаздача адказных за работу лектарскіх груп факультэтаў: журналістыкі, хімічнага і геаграфічнага. Зараз большасць факультэтаў забяспечыла неабходнае прадстаўніцтва студэнтаў у гэтай школе. Але зрабілі гэта не ўсе. Так, у школе маладога лектара найбольш прадстаўлены студэнты механіка-матэматычнага, філалагічнага, фізічнага, геаграфічнага факультэтаў (каля 80 працэнтаў усіх слухачоў), у той час як ад факультэта журналістыкі ў школе маладога лектара навучаецца толькі 6 студэнтаў, ад хімічнага—7.

Камітэт камсамола універсітэта ў бягучым навучальным годзе рэкамендаваў на заняткі школы камсамольскага актыву гістарычнага факультэта запрашаць студэнтаў іншых факультэтаў. Кіраўнік гэтай школы У. Карагін — ініцыятыўны камуніст. Заняткі школы камсамольскага актыву сталі наведваць не толькі студэнты універсітэта, але і радыётэхнічнага інстытута.

Некалькі палепшылася работа прафсаюзных арганізацый. Прафком універсітэта ў 1978-79 годзе сочыць за работай аддзяленняў бальнага танца, мастакоў-афарміцеляў, фотакарэспандэнтаў. Для заняткаў аддзялення бальнага танца прафком прадаставіў актавую залу інтэрната № 7. У лютым 1979 года намечана правесці конкурс на лепшы праект афармлення студэнцкага інтэрната і конкурс на лепшыя фотаздымкі аб жыцці універсітэта. У культурна-выхаваўчай камісіі прафкома выдзелены адказныя за работу клуба мастацкай самадзейнасці, за кантроль наведваемасці заняткаў слухачамі ФГП. У студзені 1979 года плануецца абмеркаваць пытанне аб удзеле прафсаюзных арганізацый факультэта прыкладной матэматыкі і геаграфічнага факультэта ў рабоце ФГП.

Аднак прафсаюзны камітэт і камітэт камсамола, таксама як і камітэты камсамола і прафбюро факультэтаў, яшчэ не ў поўнай меры ўключыліся ў работу факультэта грамадскіх прафесій. Стан спраў у школах ФГП не аналізуецца і не плануецца, слаба здзяйсняецца кантроль за наведваемасцю заняткаў, не прымаюцца меры ўздзеяння да тых слухачоў, якія прапускаюць заняткі без уважлівых прычын.

На Ўсесаюзным злёце студэнтаў Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыш Л. І. Брэжнеў падкрэсліў, што партыя кроўна зацікаўлена ў тым, каб студэнт рос чалавекам з ярка выяўленай грамадскай жылкай. Таму задача камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый—прыцягваць студэнцкую моладзь да выканання грамадскіх даручэнняў. Але гэта работа не ў поўнай меры адпавядае сучасным патрабаванням. Студэнцкія грамадскія арганізацыі яшчэ слаба ўдзельнічаюць у камплектаванні школ факультэта, недастаткова выкарыстоўваюць слухачоў ФГП у лекцыйна-прапагандысцкай, культурна-масавай, спартыўнай рабоце не толькі сярод студэнтаў БДУ, але і ў падшэфных школах, ГПТВ, на прадпрыемствах і будоўлях рэспублікі, недастаткова рэкамендуюць выпускнікоў факультэта ў студэнцкія грамадскія арганізацыі, органы студэнцкага самакіравання. Усё гэта зніжае эфектыўнасць работы факультэта грамадскіх прафесій.

Сур'ёзнай прычынай недахопаў у рабоце ФГП з'яўляецца адсутнасць прадуманай і практыкай праверанай структуры факультэта. Ва універсітэце існуе, акрамя асноўнага факультэта грамадскіх прафесій, яго філіял на гістарычным факультэце, дзе створаны і дзейнічаюць школы студэнцкага актыву, гідаў і экскурсаводаў, студэнцкіх карэспандэнтаў, арганізатараў ваенна-патрыятычнай работы. Як паказвае вопыт, усе гэтыя школы неабходны не толькі гістарычнаму факультэту, але і ўсім іншым факультэтам БДУ.

Да гэтага часу не вырашана пытанне аб правах і перавагах для слухачоў факультэта грамадскіх прафесій. Як правіла, на ФГП навучаюцца лепшыя студэнты, нашы актывісты. Яны заслугоўваюць таго, каб іх вучоба на факультэце ўлічвалася пры правядзенні грамадска-палітычнай атэстацыі, пры размеркаванні на работу, каб ім дадаткова залічваліся балы пры падвядзенні вынікаў у канцы вучобы. Гэта створыць дадатковы стымул для ўдзелу студэнцкай моладзі ў рабоце факультэта. На жаль, нават пры правядзенні грамадска-палітычнай атэстацыі ў шэрагу выпадкаў вучоба на ФГП не ўлічваецца, не адлюстроўваецца ў характарыстыках студэнтаў.

Належыць вырашыць пытанне аб ролі і месцы кіраўнікоў школ і факультэта грамадскіх прафесій, узняць іх аўтарытэт. На практыцы пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва не ўлічваецца работа кіраўнікоў школ, выкладчыкаў, якія аддаюць свае сілы і вольны час справе арганізацыі навучальнага працэсу на факультэце.

І, нарэшце, настаў час замацаваць школы ФГП, як гэта робіцца ў многіх ВНУ краіны, за факультэтамі і кафедрамі грамадскіх навук. Гэта палепшыць каардынацыю дзейнасці факультэта грамадскіх прафесій з работай кафедр, узбагаціць працэс камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі.

**І. МАРЧАНКА,**
**дацэнт кафедры гісторыі БССР.**

# КАБ ЛЕКЦЫЯ ВЫКЛІКАЛА ЦІКАВАСЦЬ...

Пытанні, узнятыя студэнткай факультэта журналістыкі Л. Чыжовай у заметцы «Я б у лектары пайшоў...», уяўляюць несумненную цікавасць. Выступленні студэнтаў іншых факультэтаў на гэтую тэму закранаюць шэраг палажэнняў, якія датычацца падрыхтоўкі і чытання лекцый, недахопаў, існуючых у рабоце камсамольскіх арганізацый і арганізацый таварыства «Веды», выказваюць прапановы, накіраваныя на паляпшэнне лекцыйнай прапаганды і г. д.

У «Палажэнні аб грамадска-палітычнай практыцы студэнтаў у БДУ імя У. І. Леніна» сказана, што адным з відаў грамадскай работы студэнтаў можа быць падрыхтоўка рэферата або тэксту лекцыі па актуальнай праблеме марксізму-ленінізму і выступленне ў студэнцкай аўдыторыі або перад слухачамі па-за ВНУ». З гэтага палажэння зусім не вынікае, што кожны студэнт павінен рыхтаваць і чытаць лекцыі перад рознымі катэгорыямі слухачоў. Акрамя гэтага пункта, ёсць і іншыя, якія вызначаюць характар работы па грамадска-палітычнай практыцы.

**На наш погляд, чытаць лекцыі перад шырокай аудыторыяй не можа і не павінен кожны студэнт.** Нельга не згадзіцца з думкай удзельнікаў дыскусіі аб тым, што ў лектарскія групы неабходна ўключаць тых студэнтаў, якія самі хочуць навучыцца рыхтаваць і чытаць лекцыі па пытаннях, якія іх цікавяць. Калі такога жадання ў студэнта няма, то з яго лектар не атрымаецца. Але аднаго жадання, канешне, недастаткова. Падрыхтоўка лекцыі, яе удасканаленне патрабуюць шмат часу і пастаяннай работы над сабой. Калі вы падрыхтавалі лекцыю, прачыталі яе раз, два ці нават пяць разоў, то гэта не значыць, што вы дасягнулі пастаўленай мэты. Каб стаць кваліфікаваным і добра падрыхтаваным лектарам, неабходна па распрацоўваемай тэме збіраць і сістэматызаваць матэрыял не месяц, не два, а пастаянна. Трэба прачытаць лекцыю не адзін дзесятак разоў перад рознымі аудыторыямі, паглядзець, як яна ўспрымаецца слухачамі, звярнуць увагу на недахопы, якія былі заўважаны пры яе чытанні, з тым, каб потым іх не паўтараць. Каб лекцыя выклікала цікавасць у слухачоў, неабходна ведаць мноства фактаў, лёгка валодаць імі, умела іх аналізаваць, абагульняць і рабіць адпаведныя вывады.

Па уласнаму вопыту ведаю, што да кожнай катэгорыі слухачоў павінен быць дыферэнцыяваны падыход, і перш чым ісці ў тую ці іншую аўдыторыю, пытаюся, які састаў слухачоў, і ў адпаведнасці з гэтым прадумваю план выступлення, падбіраю матэрыялы і факты, якія могуць быць выкарыстаны для данай катэгорыі слухачоў. Нельга аднолькава чытаць лекцыю, напрыклад, для вучняў 9—10 класаў, настаўнікаў або навуковых работнікаў.

Немалаважнай якасцю лектара павінна быць уменне бачыць аудыторыю, валодаць ёю. Калі лектар заўважыў, што слухачы пачынаюць стамляцца, не ўспрымаюць матэрыял, які ім даецца, трэба прывесці такія факты і прыклады, якія дазволяць зняць нервовае напружанне.

Хацелася б яшчэ некалькі слоў сказаць аб тэмах лекцый. **На наш погляд, асноўнай тэмай выступленняў студэнтаў можа быць расказ аб факультэтах, універсітэце, аб будучых прафесіях.** Галоўнай аудыторыяй павінны стаць сярэднія школы, тэхнікумы, воінскія часці, слухачы якіх потым змогуць стаць студэнтамі нашага універсітэта. З іншымі тэмамі лепш за ўсё выступаць у студэнцкіх групах, на навуковых канферэнцыях і іменна тут набываць першапачатковыя лектарскія навыкі.

**Такім чынам на пытанне, ці чытаць студэнту лекцыі, можна адказаць: так, чытаць.** Але каб стаць кваліфікаваным і добра падрыхтаваным лектарам, неабходна ўжо зараз, у студэнцкія гады, вучыцца спасцігаць сакрэты лектарскага майстэрства. Вопыт, набыты ў пару студэнцтва, не пройдзе бясследна. Ён дапаможа вам у будучай практычнай рабоце.

**Што ж датычыцца прапаноў, звязаных з паляпшэннем работы з пачынаючымі лектарамі, то камітэтам камсамола факультэтаў, камітэту камсамола універсітэта, факультэту грамадскіх прафесій, арганізацыям таварыства «Веды» неабходна зрабіць канкрэтныя крокі, накіраваныя на паляпшэнне работы з лектарамі.** Яны павінны часцей запрашаць членаў таварыства «Веды» для выступлення перад студэнтамі і выкладчыкамі, дабівацца ліквідацыі фармалізму ў гэтай адказнай і важнай рабоце, дабівацца, каб кожны студэнт-лектар імкнуўся сапраўды прачытаць лекцыю, а не толькі паставіць пячатку на пуцёўцы таварыства. «Ліпавыя» лекцыі і пуцёўкі нікому і ніколі карысці не прыносілі і не прынясуць.

**І. СТАДУБ,**
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт, старшыня камісіі парткома па лекцыйнай прапагандзе.**



Вялікую цікавасць выклікае ў студэнтаў геалагічны музей.
Фота **Д. Прэса.**

# ХВІЛІНЫ ЭКЗАМЕНА

На вуліцы сыпле снег. Світае... На філфак толькі-толькі пачынаюць збірацца студэнты. Хто ўлятае як метэор, хуценька распранаецца, між іншым зірне ў люстра і—наверх; хто, наадварот: распранаецца марудна, валасы то прыгладзіць, то распушыць, то хвосцікі зробіць, то жгуцікам закруціць. Ну, цяпер, здаецца, можна ісці.

Разам з дзяўчатамі заходжу ў аўдыторыю, дзе здаюць першыя экзамены ў гэтую сесію студэнты II курса беларускага аддзялення.

Экзамен пачынаецца адказам Я. Булыгі.

— Выдатна, — падводзіць вынікі выкладчык, і дзяўчына, радасная, пакідае аўдыторыю.

— Калі ласка, заходзьце!— запрашае наступнага Сяргей Несцеравіч Чубакоў.

Аня Емяльян смела ўвайшла, усміхнулася, нібы не на экзамене, а на звычайнай лекцыі. Мо за ўсмешкай яе хаваецца хваляванне? Ці яно зусім знікла? Так бывае ў самую адказную хвіліну.

Дзяўчына садзіцца за апошні стол. Цікава, які білет ёй дастаўся? Адказ Ані сур'ёзны, грунтоўны, глыбокі. Ён не патрабуе ад выкладчыка дадатковых пытанняў.

«Пяцёрка» — своеасаблівая характарыстыка студэнта. Гонар і хвала тым, каму не трэба бяссоннай перадэкзаменацыйнай ночы, не трэба дачытваць канспект пад дзвярыма аўдыторыі або вагацца, з якога боку ляжыць лягчэйшы білет.

Вера Баёк, стараста, як правіла, наперад можа сказаць, як здасць чарговы экзамен яе група:

— Сёння «троек» не павінна быць. Рабяты ў нас моцныя, падрыхтоўка была вельмі добрая.

Але ў студэнтаў каля дзвярэй настрой традыцыйны. Раз-пораз са шматгалосся вырываецца крык душы:

— Я сёння абавязкова атрымаю «двойку»!

Ну, навошта так катэгарычна? Усе шчаслівыя білеты ляжаць пад левай рукой. Сядзеце за парту, падумаеце і ўсё ўспомніце. Ці ж не так?

У гэты дзень выдатных адказаў было нямала. І толькі ўгледзеўшыся ў шчаслівыя, крыху стомленыя твары студэнтаў, можна сказаць — «чацвёркі» і «пяцёркі» здабываюцца нялёгкай працай. Але хто ж гэтага не ведае?!

Экзамены працягваюцца. Наперадзе яшчэ многа хвалюючых і шчаслівых хвілін.

Развітваючыся з групай і пажадаўшы «ні пуху», я яшчэ крышачку пастаяў каля экзаменацыйнай аўдыторыі, прыслухоўваючыся да ўзрушаных галасоў...

**А. МАРЧУК.**

# ФОРМУЛА ЖЫЦЦЯ

У жыцці кожнага ёсць сцяжынка, якая выводзіць на бальшак. Для Надзі Цыркун, цяпер аспіранткі, шлях у навуку адкрываўся са звычайнага студэнцкага гуртка. Працавала музычным кіраўніком у дзіцячым садзе. Пасля работы спяшалася ва універсітэт, дзе займалася на вячэрнім аддзяленні філасофіі гістарычнага факультэта.

— У нас на гістфаку дзейнічаў гурток псіхалогіі, — успамінае Надзя. — Вабіў ён мяне. Чым? Можа сваёй гучнай назвай. А можа тым, што хацелася больш ведаць аб сабе, іншых. Запісалася. Неўзабаве кіраўнік гуртка Алена Паўлаўна Ерась прапанавала тэмы навуковых работ. І я абрала эксперыментальную. Хацелася разважаць і шукаць, адшукваць і прымяняць. На рабоце калі-нікалі выпадала і часіна для заняткаў. Навуковая тэма аказалася сугучнай маёй рабоце з дзецьмі. Так што жаданне, як кажуць, супала з магчымасцямі.

Эксперыменты захоплівалі яе цалкам. Крок за крокам яна адкрывала ў дзецях новае для сябе, непаўторнае.

— З імі працаваць вельмі цікава. Народ яны дапытлівы. Я і сама вучылася з імі настойлівасці.

Крыху пазней, назіраючы за дзецьмі, малады эксперыментатар зробіць вывад: настойлівасць — гэта ўменне з неаслабнай энергіяй, не зніжаючы валявога намагання, доўгі час падпарадкоўваць свае ўчынкі рашэнню пэўных задач. І тут жа ўзнікалі новыя пытанні: «А калі ў цябе няма настойлівасці? Ці можна яе выхаваць?» І зноў эксперыменты, пошук.

Аб актуальнасці і каштоўнасці даследавання гаворыць хаця б такі факт. Навуковая дзейнасць Надзі Цыркун двойчы адзначалася дыпломам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР за работы, аднесеныя да першай катэгорыі на рэспубліканскіх аглядах навуковых работ. А нядаўна на Усесаюзным аглядзе-конкурсе Надзя ўзнагароджана медалём «За лепшую студэнцкую работу».

У нашай гутарцы палову сваіх поспехаў маладая аспірантка адрасавала Рэму Восіпавічу Вадэйку, яе старэйшаму таварышу і дарадчыку.

— Рэм Восіпавіч на рэдкасць сціплы, добрасумленны педагог, душэўны і шчодры чалавек. І я лічу, што мне проста пашчасціла на кіраўніка. Свой талент чалавека, лепшыя рысы арганізатара, выкладчыка і педагога Рэм Восіпавіч перадае нам, маладым.

Ідэі, праблемы, пошук сталі неад'емнымі атрыбутамі ў жыцці Надзі. Яна марыць напісаць кандыдацкую дысертацыю аб новых эксперыментах. Сабран багаты матэрыял, які прадстаіць у бліжэйшы час апрацаваць.

У школе Надзя захаплялася музыкай. Ёй прадказвалі будучыню музыканта. Пасля васьмігодкі яна скончыла музычнае вучылішча па класу фартэпіяна. На развітанне я запытала, ці шкадуе яна, што пакінула музыку, і пачула:

— Музыку я люблю па-ранейшаму. Яна мне вельмі дапамагае.

**Л. ЖЫЛІНСКАЯ.**

# НАВУКОВЫЯ ПОШУКІ

У рабоце студэнцкага навуковага таварыства хімічнага факультэта прымаюць удзел больш 400 чалавек. У асноўным гэта студэнты чацвёртых і пятых курсаў. Аднак ужо сёння і многія першакурснікі ўключаюцца ў нялёгкую, але цікавую навуковую работу.

Ахова прыроды — адна з актуальных праблем нашага часу. Ад яе правільнага вырашэння залежыць будучыня чалавецтва. У гэтай галіне студэнты хімічнага факультэта вырашаюць пытанні ачысткі сцёкавых вод і выхлапных газаў.

На кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання галоўным кірункам навуковай работы з'яўляецца вывучэнне якасцей і структур арганічных і неарганічных іёнаабменных рэчываў. Таксама вядуцца даследаванні з мэтай атрымання неарганічных клеяў і пакрыццяў, якія могуць вытрымліваць шматразовае тэрмацыклаванне да 1500 градусаў па Цэльсію.

Многія навуковыя работы студэнтаў удастоены дыпломаў рэспубліканскага і ўсесаюзнага конкурсаў. Па выніках мінулагодняга рэспубліканскага конкурсу на лепшую студэнцкую работу па прыродазнаўчых навуках 29 студэнтаў факультэта ўзнагароджаны дыпломамі І ступені. Сярод іх В. Сяргеева, Н. Ляўчук, С. Снапко, Г. Ражкова, А. Сялевіч і інш. Дыпломы II і III ступені атрымалі студэнты Н. Маслаў і В. Бяляцкі. Прыемна адзначыць, што студэнт II курса Дзмітрый Рубінаў стаў дыпламантам Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс».

**Н. КАРАБЦОВА,**
**студэнтка II курса журфака.**

ВЕСТКІ З ПАДРЫХТОЎЧАГА

# ПЕРШЫ СХОД

**8 снежня у актавай зале факультэта журналістыкі прайшоў агульны сход слухачоў падрыхтоўчага аддзялення.**

**Адкрыў яго загадчык падрыхтоўчага аддзялення А. Г. Слука. Ён павіншаваў прысутных з паступленнем на аддзяленне і расказаў аб гісторыі універсітэта.**

**Вялікую зацікаўленасць у слухачоў выклікаў расказ аб сучасным і будучым БДУ, аб надзённых праблемах, распрацоўваемых лабараторыямі і інстытутамі універсітэта і цесна звязаных з патрэбамі народнай гаспадаркі.**

**Выступаючы звярнуў увагу слухачоў на тыя задачы, якія пастаўлены перад імі, на тыя цяжкасці, што непазбежна сустрэнуцца ў іх студэнцкім жыцці.**

**Аб правільнай арганізацыі навучальнага працэсу і каардынаванай самападрыхтоўцы нам паведаміла Марыя Пятроўна Карповіч, намеснік загадчыка падрыхтоўчага аддзялення.**

**Наступныя выступленні — намесніка сакратара камсамольскай арганізацыі БДУ В. Левашэвіча і намесніка старшыні прафкома БДУ Р. Смаленскай.**

**На сходзе былі праведзены выбары ў камсамольскія і прафсаюзныя органы.**

**В. ЛОМШЫК,**
**слухач падрыхтоўчага аддзялення.**



Заняткі па ядзернай фізіцы ў студэнтаў III курса фізфака.
Фота **М. Дубовіка.**

# «Беларускі універсітэт»—79

**ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ! Мінуў яшчэ адзін год нашага жыцця, і, як звычайна, гэта прымушае нас азірнуцца, задумацца над пройдзеным. Кожны дзень у рэдакцыю нашай газеты паступаюць пісьмы студэнтаў і выкладчыкаў, у якіх яны расказваюць аб найбольш цікавых падзеях свайго жыцця, аб людзях, з якімі вучацца або працуюць. Многія пісьмы надрукаваны ў газеце. Жывое слова чытача — аснова баявітасці і дзейснасці газеты.**

**Рэдакцыйная калегія будзе вам вельмі ўдзячна, калі вы адкажаце на пытанні нашай анкеты.**

**Разам з камсамольскай арганізацыяй універсітэта, з вучэбнай групай вамі пражыт год, поўны добрых спраў, карысных пачынанняў. Што неабходна зрабіць газеце, каб добрых спраў стала яшчэ больш, а недахопы ўсё радзей знаходзілі месца ў нашым жыцці?**

---

**Што з надрукаванага ў газеце ў 1978 годзе засталося ў памяці? Якія тэмы, рубрыкі неабходна працягваць у будучым годзе? Прапануйце новыя.**

---

**Кожны дзень жыццё ставіць перад намі складаныя маральныя праблемы. Якія з іх неабходна абмеркаваць на старонках шматтыражкі?**

---

**Сярод вашых сяброў шмат выдатных, таленавітых людзей. Аб кім з іх вы хацелі б прачытаць у нашай газеце?**

---

**Мы жывем у краіне слаўных баявых, рэвалюцыйных, працоўных традыцый. Што яшчэ неабходна зрабіць, каб увекавечыць подзвігі нашых дзядоў, бацькоў, іх працоўную славу?**

---

**Ці падабаюцца вам тэматычныя старонкі «Рамонак» (клуб аматараў прыроды), «Кафедра агульнага смехаробства» (юмарыстычная і сатырычная старонка), «Старонка першакурсніка», «Спорт», «Літаратура і мастацтва», «Старонка народнага кантролю»; што неабходна зрабіць для таго, каб палепшыць гэтыя старонкі; якія яшчэ тэматычныя старонкі вы хацелі б прачытаць?**

---

**Можа, не ўсе матэрыялы універсітэцкай шматтыражкі вам спадабаліся. Чаму?**

---

**Мы хацелі б ведаць, з кім размаўляем: са студэнтам, выкладчыкам, аспірантам або супрацоўнікам. Укажыце, калі ласка, ваш узрост і прафесію.**

---

**Вашы адказы накіроўвайце у камітэт камсамола універсітэта (галоўны корпус, пакой 207).**



Паспяхова працягваецца творчы кантакт студэнтаў універсітэта з прадстаўнікамі мастацкіх калектываў сталіцы рэспублікі.

**На здымку:** перад студэнтамі хімфака выступае заслужаная артыстка БССР Людміла Цімафеева.

Фота М. Дубовіка.

СПОРТ

## За майстэрства і масавасць

Фізкультурны калектыў БДУ імя У. І. Леніна павінен быць адным з вядучых у рэспубліцы. Іменна аб гэтым ішла размова на чарговай XII справаздачна-выбарнай канферэнцыі спортклуба універсітэта.

На першы погляд справа з развіццём масавай фізічнай культуры і спорту ў БДУ абстаіць нядрэнна. За справаздачны перыяд у калектыве падрыхтавана 8 майстроў спорту, 26 кандыдатаў у майстры, 121 першаразраднік, 8515 спартсменаў масавых разрадаў, 4964 значкісты комплексу ГПА.

Пытанні развіцця фізкультуры і спорту заслухоўваюцца на пасяджэннях савета і рэктарата універсітэта. Прынята рашэнне аб абавязковым правядзенні заняткаў фізвыхавання сярод студэнтаў III курсаў. Па 22 відах спорту праведзены XXV і XXVI спартакіяды БДУ, у якіх прыняло ўдзел звыш 6000 студэнтаў. Два гады запар у ёй перамагалі студэнты фізічнага факультэта. Добрыя спартыўныя паказчыкі таксама ў студэнтаў гістарычнага, механіка-матэматычнага, юрыдычнага і іншых факультэтаў. 1109 выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта прынялі ўдзел у спартакіядзе «Здароўе».

Дзейнасць спортклуба універсітэта адзначана пераходным Чырвоным сцягам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюзаў як пераможцы ўсесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва сярод ВНУ сваёй групы. Аб гэтым гаварыў у справаздачным дакладзе старшыня спортклуба БДУ В. П. Шапялевіч.

Разам з тым спартсмены універсітэта пачынаюць здаваць свае пазіцыі ў рэспубліцы. Дрэнна абстаіць справа з падрыхтоўкай майстроў высокага класа, членаў зборных каманд рэспублікі і краіны. Так, на II Усесаюзных спартыўных гульнях моладзі толькі два прадстаўнікі БДУ выступілі ў асноўным саставе зборнай БССР, але і яны не прынеслі ніводнага залікoвага ачка. На сённяшні дзень кандыдатамі ў зборную рэспублікі для ўдзелу ў стартах VII летняй спартакіяды народаў СССР уваходзяць толькі 5 студэнтаў — столькі, колькі і ад Мазырскага педінстытута, дзе займаецца ўсяго 2000 чалавек. Па падрыхтоўцы спартсменаў рэспубліканскага ўзроўню наш універсітэт займае 16 месца, адно з апошніх сярод беларускіх ВНУ.

Слабай па-ранейшаму ва універсітэце застаецца спартыўная база, няма моцных зборных каманд па многіх відах спорту. Недасканалай застаецца сістэма падвядзення вынікаў агульнауніверсітэцкай спартакіяды. Улічваючы тое, што 68,3 працэнта студэнтаў універсітэта складаюць дзяўчаты, было прапанавана аддаць перавагу развіццю жаночых відаў спорту.

На канферэнцыі таксама выступілі студэнт фізфака У. Маланік, старшыня турклуба універсітэта А. І. Новікаў, старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту В. Ф. Кавалёў, старшыня спортбюро П. Навумаў, старшыня Белсавета СДСТ «Буравеснік» Я. Г. Копаць, рэктар БДУ акадэмік У. А. Белы.

Удзельнікі канферэнцыі прынялі пастанову, у якой вызначаны меры па далейшаму развіццю фізкультурна-масавай і спартыўна-аздараўленчай работы ва універсітэце.

**У. ШЫК.**

Твой музычны клуб

## У ЦАРСТВЕ ФАРБАЎ І ГУКАЎ

— Добры вечар, — вітаецца вядучы — высокі чарнявы хлапец і, націскаючы некалькі кнопак на шырокім пульце, дадае:

— Мы запрашаем вас, дарагія сябры, на чарговае пасяджэнне музычнага клуба фізічнага факультэта.

Гасне святло, і пад прыцiхшыя гукі музыкі на невялікім экране ўзнікае каляровы краявід. Праз некалькі хвілін яго змяняе другі, і здаецца, што ты апынуўся ў сапраўдным царстве фарбаў і гукаў.

— Наш музычны клуб, ці, інакш кажучы, дыскатэка — яшчэ зусім малады, — расказаў у перапынку адзін з членаў клуба трэцякурснік Сяргей Гапоненка. — Але нягледзячы на гэта работа дыскатэкі была адзначана на факультэцкай камсамольскай канферэнцыі. І мне вельмі прыемна, што добрае пачынанне, якое было зроблена маімі сябрамі Паўлам Дынько і Валерыем Кірыльчыкам, ініцыятарам і стварэння клуба, не было дарэмным.

**— Сяргей, калі ласка, раскажы, як праходзіць падрыхтоўка да пасяджэнняў клуба!**

— Перш за ўсё мы выбіраем нейкую пэўную тэму. Потым падбіраем па ёй неабходную літаратуру і падрыхтоўваем так званыя слайдфільмы.

Кожны член нашага калектыву мае свае пэўныя даручэнні. Сюды ўваходзяць: падрыхтоўка музычных праграм і іх тэхнічнае забеспячэнне, выпуск насценнай газеты. У апошні час мы практыкуем правядзенне музычнай латарэі, якая карыстаецца вялікім поспехам сярод нашых гасцей. Жадаючыя маюць магчымасць выйграць пласцінку з запісамі любімага спевака ці ансамбля.

**— А што такое слайдфільмы?**

— Разам з выкарыстаннем колерамузычных эфектаў мы паказваем звыш ста слайдаў. Прычым яны аб'яднаны пэўнай тэмай. Мы лічым, што гэта дапамагае больш наглядна і цікава весці гутарку.

**— Я ведаю, што кожнае пасяджэнне клуба збірае вялікую колькасць аматараў папулярнай музыкі, але ў кожнага свой густ і патрабаванні...**

— Мы робім усё магчымае, каб задаволіць усю аўдыторыю. Гэта накіроўвае нас на пошук самых разнастайных тэм. Напрыклад, плануецца правесці некалькі гутарак аб развіцці сучаснай рок-джаз музыкі ў нашай краіне і за мяжой. Цікавяць нас таксама і тыя плыні, якія існуюць у сучаснай маладзёжнай музыцы.

Звяртаемся мы і да класічнай спадчыны. Нядаўна адбылася размова аб творчасці І. С. Баха. Рыхтуецца вечар, прысвечаны музычнай культуры Італіі. Безумоўна, для ажыццяўлення гэтых планаў неабходна падняць прафесіянальны ўзровень нашых пасяджэнняў. Я лічу, што без дапамогі спецыялістаў, музыказнаўцаў нам не абысціся.

**— Сяргей, у пачатку нашай размовы ты ўпамянуў аб выкарыстанні адпаведнай крытычнай літаратуры. Але, наколькі мне вядома, яе надзвычай мала, асабліва пра замежную музыку. Як вы выходзіце з гэтага становішча?**

— Калі гаварыць шчыра, дык гэта не галоўная цяжкасць, з якой праходзіцца сутыкацца. Нас больш хвалюе адсутнасць неабходнай матэрыяльнай дапамогі з боку камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый універсітэта. Таму амаль уся тэхнічная база складаецца ў асноўным з асабістых сродкаў членаў клуба. А што датычыцца неабходнай літаратуры, то існуе такая рэч, як сувязь з іншымі дыскатэкамі. Напрыклад, некалькі пасяджэнняў нашага клуба было праведзена разам з дыскатэкай факультэта прыкладной матэматыкі. У будучым мы абавязкова паспрабуем наладзіць творчыя кантакты з музычнымі клубамі інстытута народнай гаспадаркі і педагагічнага. Асаблівую цікавасць для нас мае вопыт прыбалтыйскіх рэспублік.

**— І апошняе. У чым вы бачыце карысць такіх клубаў?**

— Ведаеце, гэта пытанне вельмі актуальнае зараз. Колькасць прыхільнікаў папулярнай музыкі няспынна расце. Слухаюць шмат і часам не заўжды тое, што можна аднесці да разраду патрэбнага. Я лічу, што кожны музычны клуб ці дыскатэка павінны не толькі весці нястомны пошук новых форм і метадаў папулярызацыі сучаснай музыкі, але і фарміраваць, выпрацоўваць у моладзі пэўны музычны густ, пэўную музычную культуру. Гэта справа вельмі патрэбная і разам з тым вельмі складаная. І за ёй будучыня.

Інтэрв'ю правёў
**С. ЛЫСКАВЕЦ.**

Рэдактар А. ДЗЕРАШ

НАШ АДРАС

220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.